БРЭСЦКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА
імя М. ГОРКАГА
АДДЗЕЛ БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА

# КАЛЯНДАР

## знамянальных і памятных дат

# 2025



БРЭСТ, 2024

Складальнікі: Ю. М. Майкевіч
А. В. Пастыка

Рэдактар: Л. К. Кароль

Адказны за выпуск А. Я. Стрыжэвіч

**Каляндар знамянальных і памятных дат на 2025 год** / Брэсцкая абласная бібліятэка імя М. Горкага, Аддзел бібліятэказнаўства ; [складальнікі: Ю. М. Майкевіч, А. В. Пастыка ; рэдактары: Л. К. Кароль, А. С. Кузьміна]. – Брэст, 2024. – 115 с.

Пры поўным або частковым капіяванні і выкарыстанні матэрыялаў спасылка на крыніцу абавязковая.

224016, г. Брэст, бульвар Касманаўтаў, 48
Установа культуры «Брэсцкая абласная бібліятэка імя М. Горкага»
Аддзел бібліятэказнаўства

+375 162 53 04 40
e-mail: brestrl@mail.ru

«**Каляндар знамянальных і памятных дат на 2025 год**», які створаны аддзелам бібліятэказнаўства Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага, уключае асноўныя раздзелы:

1. ***«Даты беларускага і краязнаўчага календара»:*** уключаны юбілеі рэспубліканскага значэння ў галіне літаратуры і мастацтва; юбілеі знакавых падзей, дзяржаўныя, агульнарэспубліканскія, рэлігійныя святы, памятныя даты; памятныя даты вобласці; юбілеі дзеячаў, жыццё або дзейнасць якіх звязаны з Брэстчынай.
2. ***«Даты российского и зарубежного календаря»:*** уключаны найбольш значныя даты расійскага і замежнага календара; юбілеі паэтаў, пісьменнікаў, літаратуразнаўцаў, а таксама найбольш вядомых дзеячаў мастацтва, палітыкі і грамадства.
3. ***«Книги-юбиляры».***

Выкарыстаная літаратура:

Беларускі каляндар, 2025 год / рэдактар-складальнік А. М. Маліноўская // Новыя кнігі: па старонках беларускага друку. – 2024. – № 8. – С. 1–16 (дадатак).

Знаменательные даты, 2015 : универсальный энциклопедический календарь-журнал / редакторы-составители: Наталья Рожкова, Диана Шалаева. – Москва : Либер-Дом, 2014. – 752 с.

Літаратурная карта Берасцейшчыны / Галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы Брэсцкага аблвыканкама ; рэдактар і ўкладальнік А. Крэйдзіч ; рэдакцыйны савет: Л. А. Цупрык (старшыня) [і інш.]. – Брэст : Брэсцкая друкарня, 2008. – 567 с.

Мастакі Брэстчыны : каталог / Беларускі саюз мастакоў ; складальнік П. А. Рабаў ; прадмова: П. А. Рабаў, П. Васілеўскі. – Брэст : Брэсцкая друкарня, 2019. – 107 с.

Творчы партрэт пісьменніцкай суполкі : біябібліяграфічны даведнік Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі / складальнік Н. М. Парчук ; пад рэдакцыяй Т. А. Дземідовіч. – Брэст : Альтэрнатива, 2018. – 175 с.

Беларусь у асобах і падзеях : анлайн-энцыклапедыя // Нацыянальная бібліятэка Беларусі : афіцыйны сайт. – URL: https://bis.nlb.by/ru (дата звароту: 21.10.2024).

# ДАТЫ БЕЛАРУСКАГА І КРАЯЗНАЎЧАГА КАЛЕНДАРА

**У 2025 годзе спаўняецца:**

**1140** гадоў з часу першага ўпамінання ў «Аповесці мінулых гадоў» (885) **ПАСЛАНЦОЎ** князя Алега да радзімічаў, што лічыцца за пачатак **ПАШТОВАЙ СУВЯЗІ ў БЕЛАРУСІ**

**1050** гадоў з часу стварэння **УЛАДЗІМІРА-БЕРАСЦЕЙСКАЙ ПРАВАСЛАЎНАЙ ЕПАРХІІ** (канец Х ст. – 1596), адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі праваслаўнай царквы

**960** гадоў з дня нараджэння **МІНЫ ПОЛАЦКАГА** (не пазней 1065, г. Полацк, Віцебская вобласць – 1116), епіскапа полацкага, аднаго з першых архіпастыраў, які спрыяў распаўсюджванню хрысціянства на тэрыторыі Беларусі, святога Беларускай Праваслаўнай Царквы

**895** гадоў з дня нараджэння **КІРЫЛЫ ТУРАЎСКАГА** (каля 1130 ці 1113, г. Тураў – каля 1182 (ці 1184) ці пасля 1190), беларускага і ўсходнеславянскага царкоўнага дзеяча, пісьменніка-прапаведніка, аўтара вядомых царкоўна-асветніцкіх і царкоўна-літаратурных твораў, святога Беларускай Праваслаўнай Царквы

**840** гадоў з часу напісання **«СЛОВА аб ПАЛКУ ІГАРАВЫМ»** («СЛОВА пра ПАХОД ІГАРАВЫ») (канец 1185–1187?), помніка літаратуры XII ст., сюжэт якога пабудаваны вакол няўдалага паходу 1185 г. некаторых князёў паўднёвай Русі на чале з Ігарам Святаславічам супраць полаўцаў

**830** гадоў з дня нараджэння **МІНДОЎГА** (1195?–1263), заснавальніка і першага вялікага князя адной з найбуйнейшых еўрапейскіх дзяржаў — Вялікага Княства Літоўскага

**805** гадоў з дня нараджэння **СІМЯОНА ПОЛАЦКАГА** (1220, г. Полацк – 1289), царкоўнага дзеяча, епіскапа полацкага і цвярскога, святога Беларускай і Рускай Праваслаўных Цэркваў

**785** гадоў з часу ўтварэння **ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА** (ВКЛ; 1240–1795), усходнееўрапейскай феадальнай дзяржавы, якая існавала на тэрыторыі сучаснай Беларусі і Літвы, а таксама часткова Украіны, Расіі, Латвіі, Польшчы, Эстоніі і Малдовы

**750** гадоў з часу нараджэння **ГЕДЗІМІНА** (ГЕДЫМІНА; каля 1275–1341), вялікага князя Вялікага Княства Літоўскага, палкаводца, выдатнага дыпламата, які больш чым у два разы павялічыў тэрыторыю дзяржавы; прадстаўнікі дынастыі якога былі ўладарамі Польшчы, Чэхіі і Венгрыі і знаходзіліся да 1572 г. на прастоле Вялікага Княства Літоўскага

**675** гадоў з дня нараджэння **ВІТАЎТА** (1350–1430), князя гродзенскага, трокскага, вялікага князя Вялікага Княства Літоўскага, аднаго з самых выдатных дзяржаўных дзеячаў Вялікага Княства Літоўскага, якога летапісцы ўшанавалі «Пахвалой Вітаўту», уключанай у «Летапіс вялікіх князёў літоўскіх»

**655** гадоў з дня нараджэння **СВІДРЫГЫЙЛЫ** (каля 1370–1452), вялікага князя Вялікага Княства Літоўскага

**635** гадоў з часу атрымання **г. БРЭСТАМ ГРАМАТЫ на МАГДЭБУРГСКАЕ ПРАВА** (1390), першым з беларускіх гарадоў

**565** гадоў з дня нараджэння **КАНСТАНЦІНА ІВАНАВІЧА АСТРОЖСКАГА** (1460?–1530), дзяржаўнага дзеяча Вялікага Княства Літоўскага, военачальніка, мецэната

**555** гадоў з дня нараджэння **МІКОЛЫ ГУСОЎСКАГА** (1470-я – 1533?), беларускага і польскага паэта-гуманіста, мысліцеля і асветніка эпохі Адраджэння

**555** гадоў з часу з’яўлення **ЖЫРОВІЦКАГА АБРАЗА МАЦІ БОЖАЙ**, адной з галоўных хрысціянскіх святынь Беларусі (аг. Жыровічы, Слонімскі р-н; 1470)

**535** гадоў з дня нараджэння **ФРАНЦЫСКА** (ФРАНЦІШКА) **СКАРЫНЫ** (каля 1490, г. Полацк – 1551?), аднаго з самых ганаровых дзеячаў эпохі Адраджэння і Рэфармацыі ў Беларусі, першадрукара, асветніка-гуманіста, пісьменніка, грамадскага дзеяча, мастака-графіка, вучонага-медыка, батаніка і астранома, прадпрымальніка, які пераклаў і выдаў Біблію беларускім ізводам царкоўнаславянскай мовы

**505** гадоў з часу заснавання Францыскам Скарынам у доме мецэната Я. Бабіча **ВІЛЕНСКАЙ ДРУКАРНІ**, першай на Беларусі (г. Вільня; пачатак 1520-х – 1525)

**505** гадоў з дня нараджэння **АСТАФІЯ** (ЯЎСТАФІЯ) **БАГДАНАВІЧА ВАЛОВІЧА** (каля 1520, Гродзеншчына – 1587 ці 1590), дзяржаўнага і грамадскага дзеяча Вялікага Княства Літоўскага, гуманіста, правазнаўца, мецэната-асветніка

**505** гадоў з дня нараджэння **МАЦЕЯ КАВЯЧЫНСКАГА** (1520-я – 1572), кнігавыдаўца, аднаго з заснавальнікаў Нясвіжскай друкарні, перакладчыка, рэфармацыйнага дзеяча

**495** гадоў з дня нараджэння **СЫМОНА БУДНАГА** (каля 1530, Беластоцкае ваяв. – 1593), дзеяча беларускай культуры, мысліцеля-гуманіста, філосафа, асветніка, рэлігійнага рэфарматара, філолага, паэта, кнігавыдаўца Вялікага Княства Літоўскага

**495** гадоў з дня нараджэння **ДАНІЭЛЯ ЛАНЧЫЦКАГА** (мян. ДАНІЭЛЬ з ЛАНЧЫЦЫ; каля 1530 – каля 1600), друкара (Нясвіж, Заслаўе, Вільня), які выдаў «Новы Запавет» (1564, 1570), «Катэхізіс» Сымона Буднага (1564) і іншыя значныя выданні

**495** гадоў з дня нараджэння **ВАСІЛЯ МІКАЛАЕВІЧА ЦЯПІНСКАГА** (АМЕЛЬЯНОВІЧА; 1530-я ці пач. 1540-х, Чашнікаўскі р-н – 1599 ці 1600), гуманіста-асветніка, пісьменніка, кнігавыдаўца, перакладчыка

**490** гадоў з дня нараджэння **БАЗЫЛІКА ЦЫПРЫЯНА** (КІПРЫЯНА; 1535?, Польшча – пасля 1600), беларускага і польскага дзеяча культуры, паэта, перакладчыка, кампазітара, кнігавыдаўца

**485** гадоў з дня нараджэння **НІКІФАРА ПАРАСХЕСА-КАНТАКУЗЕНА** (1540-я – 1599), архідыякана, старшыні Брэсцкага царкоўнага сабору 1596 г., святога Беларускай Праваслаўнай Царквы

**475** гадоў з дня нараджэння **ЛАЎРЭНЦІЯ ІВАНАВІЧА ЗІЗАНІЯ** (ТУСТАНОЎСКАГА; сапр., верагодна, КУКОЛЬ; 1550-я ці 1560-я – каля 1634), беларускага і ўкраінскага педагога, паэта, мовазнаўца, перакладчыка, царкоўнага дзеяча

**475** гадоў з дня нараджэння **АНДРЭЯ РЫМШЫ** (каля 1550, Наваградскае ваяв. [цяпер – Баранавіцкі р-н] – пасля 1599), паэта, заснавальніка панегірычнай паэзіі ў старажытнай беларускай літаратуры

**470** гадоў з часу першага ўпамінання **г. СТОЛІНА** (1555) у пісьмовых крыніцах

**465** гадоў з дня нараджэння **САЛАМОНА ФЁДАРАВІЧА РЫСІНСКАГА** (каля 1560, Полацкае ваяв. – 1625), польскага і беларускага паэта-лацініста, педагога, філосафа, фалькларыста, этнографа, педагога

**455** гадоў з часу заснавання **ВІЛЕНСКАГА ЎНІВЕРСІТЭТА**, найстарэйшай навучальнай установы Беларусі і Літвы (цяпер – ВІЛЬНЮСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ; г. Вільня, 1570), заснаванай езуітамі як калегіум, органа кіравання асветай Віленскай навучальнай акругі ў 1579–1832 гг.

**455** гадоў з дня нараджэння **СТАФАНА** (СІЛЬВЕСТРА) **ІВАНАВІЧА ЗІЗАНІЯ** (ТУСТАНОЎСКАГА; сапр., верагодна, КУКОЛЬ; каля 1570 – 1600 ці да 1621), беларускага і ўкраінскага педагога, пісьменніка-палеміста, царкоўнага дзеяча

**450** гадоў з часу выдання **«ЕВАНГЕЛЛЯ НАПРАСТОЛЬНАГА»** (1575), помніка старажытнабеларускага кнігадрукавання, выдадзенага Пятром Мсціслаўцам у друкарні братоў

Мамонічаў

**445** гадоў з дня нараджэння **ЛЯВОНЦІЯ КАРПОВІЧА** (свец. ЛОНГІН (ЛОГВІН); каля 1580, г. Пінск – 1620), рэлігійнага дзеяча, пісьменніка-палеміста, аднаго з пачынальнікаў айчыннага сістэматычнага багаслоўя, першага архімандрыта Віленскага брацкага Свята-Духава манастыра, святога Беларускай Праваслаўнай Царквы

**425** гадоў з дня нараджэння **КАЗІМІРА СЕМЯНОВІЧА** (каля 1600 – пасля 1651), ваеннага інжынера і тэарэтыка артылерыі, мысліцеля-гуманіста

**395** гадоў з пачатку існавання **КУЦЕІНСКАЙ ДРУКАРНІ**, цэнтра беларускага кірылічнага кнігадрукавання пры Аршанскім Куцеінскім Богаяўленскім манастыры (г. Орша; 1630–1654)

**390** гадоў з дня нараджэння **ЦЫПРЫЯНА** (Кіпрыяна) **ЖАХОЎСКАГА** (каля 1635, Полацкае ваяводства – 1693), дзеяча ўніяцкай царквы Рэчы Паспалітай, заснавальніка Супрасльскай друкарні

**385** гадоў з часу заснавання пры Васкрасенскім манастыры (1640) ігуменам Макарыем Такарэўскім **ПЕРШАЙ ШКОЛЫ** на Камянеччыне

**335** гадоў з пачатку дзейнасці **СУПРАСЛЬСКАЙ ДРУКАРНІ**, якая дзейнічала пры Супрасльскім Дабравешчанскім манастыры і выпусціла больш за 420 выданняў, сярод якіх буквары славянскай мовы, першы славяна-польскі друкаваны «Лексікон» (1772) і інш. (Беластоцкае ваяв.; пач. 1690-х – 1803)

**325** гадоў з дня нараджэння **ІАГАНА** (ЯНА) **КРЫШТОФА ГЛАЎБІЦА** (1700?, Польшча – 1767), беларускага і літоўскага архітэктара, найбуйнейшага прадстаўніка віленскага барока, стваральніка шматлікіх каталіцкіх храмаў на Беларусі

**280** гадоў з дня нараджэння **ЛЕАНА** (ЛЯВОНА) **СІТАНСКАГА** (каля 1745, г. Гродна – 1800), скрыпача, дырыжора, педагога, аднаго з выдатнейшых музыкантаў свайго часу, пад кіраўніцтвам якога Гродзенская капэла Тызенгаўза стала адной з лепшых у Еўропе

**280** гадоў з дня нараджэння **МАЦЕЯ ЯКУБАВІЧА БУТРЫМОВІЧА** (1745, Пінскі пав. – 1814), дзяржаўнага дзеяча Рэчы Паспалітай, падстарасты і мечніка Пінскага павета

**275** гадоў з пачатку існавання **НЯСВІЖСКАЙ ДРУКАРНІ,** заснаванай Радзівіламі, першай на тэрыторыі Беларусі, якая карысталася кірыліцай і выдала «Катэхізіс» С. Буднага — першую кнігу на беларускай мове (г. Нясвіж; 1750–1790-я)

**275** гадоў з часу пабудовы **КОБРЫНСКАЙ МІКАЛАЕЎСКАЙ ЦАРКВЫ** (КОБРЫНСКАЙ ЦАРКВЫ ў імя СВЯЦІЦЕЛЯ МІКАЛАЯ ЦУДАТВОРЦА), помніка драўлянага дойлідства, унесенага ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (г. Кобрын; 1750)

**260** гадоў з пачатку існавання **РУЖАНСКАГА ТЭАТРА САПЕГАЎ**, прыватнаўласніцкага тэатра, які налічваў 60 артыстаў і танцоўшчыкаў, меў музычна-оперную школу, капэлы ў Ружанах, Дзярэчыне і Зэльве (Зэльвенскі раён), (г. п. Ружаны, Пружанскі р-н; 1765–1791)

**260** гадоў з пачатку будаўніцтва **АГІНСКАГА КАНАЛА**, які злучае рэкі Нёман, Шчару, Ясельду, Прыпяць, даўжынёй 54 км (Пінскі, Івацэвіцкі і Ляхавіцкі р-ны; 1765)

**255** гадоў з часу заснавання ў **г. БРЭСЦЕ** (1770) **СУКОННАЙ МАНУФАКТУРЫ**

**250** гадоў з часу існавання **ГРОДЗЕНСКАЙ МЕДЫЦЫНСКАЙ АКАДЭМІІ**, першай у Беларусі вышэйшай навучальнай установы па падрыхтоўцы медыцынскага персаналу (г. Гродна; 1775–1781)

**250** гадоў з пачатку будаўніцтва **ДНЯПРОЎСКА-БУГСКАГА** (КАРАЛЕЎСКАГА) **КАНАЛА**, які злучае рэкі Піну і Мухавец, даўжынёй 244 км (Брэсцкі, Жабінкаўскі, Кобрынскі, Драгічынскі, Іванаўскі і Пінскі р-ны; 1775)

**240** гадоў з пачатку дзейнасці **РУЖАНСКАЙ СУКОННАЙ МАНУФАКТУРЫ** (г. п. Ружаны, Пружанскі р-н; 1785–1880)

**235** гадоў з дня нараджэння **ЯНА БАРШЧЭЎСКАГА** (1790 ці 1794, 1796 ці 1799–1851), пісьменніка, фальклрыста, выдаўца, аднаго з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры

**230** гадоў таму ў выніку трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай **г. БРЭСТ** (1795) **УВАЙШОЎ у СКЛАД РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ**

**225** гадоў з дня нараджэння **ІГНАТА РЫГОРАВІЧА КУЛАКОЎСКАГА** (1800, Пружанскі пав. – 1870), грамадскага і культурнага дзеяча, асветніка, педагога

**225** гадоў з дня нараджэння **КЕЛЯСЦІНА ІВАНАВІЧА БРЭНА** (каля 1800, Брэстчына – 1875), краязнаўца, фальклрыста, этнографа, святара

**205** гадоў з дня нараджэння **ЯНА КАЗІМІРА** (ІВАНА ФАДЗЕЕВІЧА) **ЗАВІШЫ** (1820 ці 1852–1887), археолага, пачынальніка даследавання каменнага веку на тэрыторыі Беларусі

**200** гадоў з дня нараджэння **МІХАІЛА ЛАЎРЭНЦЬЕВІЧА ВЯРОЎКІНА** (1825–1896), архівіста, археографа, аднаго са складальнікаў і рэдактараў «Гісторыка-юрыдычных

матэрыялаў» — найбуйнейшага серыйнага выдання дакументаў па гісторыі ўсходняй Беларусі XVI–XVIII стст.

**200** гадоў з часу пабудовы **НАВАМЫШСКАГА ПРААБРАЖЭНСКАГА КАСЦЁЛА**, помніка архітэктуры класіцызму з рысамі псеўдаготыкі, унесенага ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (в. Новая Мыш, Баранавіцкі р-н; 1825)

**180** гадоў з часу пабудовы **КОБРЫНСКАГА КАСЦЁЛА ЎНЕБАЎЗЯЦЦЯ ДЗЕВЫ МАРЫІ**, помніка архітэктуры позняга класіцызму, унесенага ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (г. Кобрын; 1845)

**180** гадоў з часу пабудовы **ЛЮБІШЧЫЦКАЙ ЦАРКВЫ СВЯТОЙ ГАННЫ**, помніка архітэктуры позняга класіцызму, унесенага ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (в. Любішчыцы, Івацэвіцкі р-н; 1845)

**180** гадоў з пачатку дзейнасці **МІХАЛІНСКАГА ШКЛОЗАВОДА**, аднаго з буйнейшых прадпрыемстваў Гродзенскай губерні (Пружанскі р-н; 1845–1914)

**170** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА МІКАЛАЕВІЧА БРАНТГЕНДЛЕРА** (псеўд. ЛЮБІМАЎ; 1855, г. Брэст – 1902), артыста оперы, антрэпрэнёра

**160** гадоў з часу заснавання ў **г. БРЭСЦЕ** (1865) **ЧАТЫРОХКЛАСНАЙ ПРАГІМНАЗІІ** (цяпер — адзін з карпусоў БРЭСЦКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА імя А. С. ПУШКІНА)

**160** гадоў з часу пабудавання **БРЭСЦКАЙ СІМЯОНАЎСКАЙ ЦАРКВЫ**, помніка архітэктуры руска-візантыйскага стылю, унесенага ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, галоўнай святыні Брэсцкай і Кобрынскай епархіі Беларускай Праваслаўнай Царквы — кафедральнага сабора ў імя святога Сімяона Стоўпніка (г. Брэст; 1865)

**150** гадоў з дня нараджэння **ЗАХВЕІ ВАСІЛЬЕЎНЫ ХВОРАСТ** (1875, в. Шакуны, Пружанскі р-н – 1944), беларускай народнай песенніцы, якая ведала тэксты каля трох соцень веснавых, калядных, жніўных, салдацкіх, батрацкіх, любоўных і сямейна-бытавых песень

**145** гадоў з часу адкрыцця ЗАТ **«ХОЛДЫНГАВАЯ КАМПАНІЯ „ПІНСКДРЭЎ“»**, створанага на базе фанернай фабрыкі акцыянернага таварыства братоў Лур’е (г. Пінск; 1880)

**140** гадоў з часу заснавання ААТ «**ПІНСКІ ОРДЭНА ЗНАК ПАШАНЫ СУДНАБУДАЎНІЧА-СУДНАРАМОНТНЫ ЗАВОД**», старэйшага суднабудаўнічага прадпрыемства Беларусі (г. Пінск; 1885)

**140** гадоў з часу пабудовы **ЖАБІНКАЎСКАЙ СВЯТА-ПАКРОЎСКАЙ ЦАРКВЫ**, помніка архітэктуры эклектыкі з выкарыстаннем утрыраваных форм класіцызму і рэтраспектыўна-рускага стылю, унесенага ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (г. Жабінка; 1885)

**140** гадоў з часу закладкі **СТОЛІНСКАГА ПАЛАЦАВА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ «МАНЬКАВІЧЫ»**, помніка палацава-паркавай архітэктуры канца XIX ст., былой рэзідэнцыі князёў Радзівілаў, унесенага ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (г. Столін; 1885)

**135** гадоў з дня нараджэння **ПІЛІПА ДЗЯМ’ЯНАВІЧА МЯДЗВЕДЗЯ** (1890 ці 1889, Пружанскі пав. – 1937), дзяржаўнага дзеяча БССР, удзельніка барацьбы за савецкую ўладу на Беларусі і ў Расіі, двойчы кавалера ордэна Чырвонага Сцяга

**125** гадоў з дня нараджэння **МІХАІЛА ЯЎХІМАВІЧА** (ЯФІМАВІЧА) **КРОШНЕРА** (1900–1942), кампазітара, аўтара першага нацыянальнага балета «Салавей», заслужанага артыста Беларусі

**120** гадоў з часу адкрыцця ў **в. АСТРАМЕЧАВА** на сродкі Ф. Ф. Паўленкава адной з першых у Беларусі **БЯСПЛАТНЫХ НАРОДНЫХ БІБЛІЯТЭК** (Брэсцкі р-н; 1905)

**120** гадоў з часу стварэння **БРЭСЦКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ РСДРП** (1905), якая ўдзельнічала ў падрыхтоўцы і правядзенні выступленняў салдат Брэсцкай крэпасці ў 1905–1907 гг.

**120** гадоў з часу пабудовы **БЕЛАВУШСКАЙ СВЯТА-ТРОІЦКАЙ ЦАРКВЫ**, помніка драўлянага дойлідства рэтраспектыўна-рускага стылю, унесенага ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (аг. Белавуша, Столінскі р-н; 1905)

**120** гадоў з часу пабудовы **ДАМАЧАЎСКАЙ ЦАРКВЫ СВЯТОГА ЛУКІ**, помніка архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю, унесенага ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (г. п. Дамачава, Брэсцкі р-н; 1905)

**115** гадоў з часу адкрыцця **ЗАВОДА ШКЛЯНЫХ ВЫРАБАЎ «ПІНА»** (г. Пінск; 1910)

**115** гадоў з часу адкрыцця ў **ДАВЫД-ГАРАДКУ ЦАГЛЯНАГА ЗАВОДА** ўласніка Ольпінера (Столінскі пав.; 1910)

**105** гадоў з часу адкрыцця ў **г. БРЭСЦЕ** (1920) **ГАРБАРНАГА ЗАВОДА** ўладальніка Грынберга

**105** гадоў з часу адкрыцця ў **м. ЦЕЛЯХАНЫ ЛЕСАПІЛЬНАГА ЗАВОДА** ўладальніка К. Пуслоўскага (Косаўскі пав.; 1920)

**105** гадоў з часу адкрыцця ў **г. ПІНСКУ** (1920) **МАСЛАЗАВОДА і МЛЫНА** ўладальніка А. Кунды

**105** гадоў з дня нараджэння **ІВАНА ІВАНАВІЧА ЧУКЛАЯ** (1920, Бешанковіцкі р-н – 1942), удзельніка партызанскага руху ў Пінскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну

**100** гадоў з часу пабудовы ў **г. БРЭСЦЕ** (1925) **ПЕРШАЙ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫІ**

**100** гадоў з часу заснавання ў **г. БРЭСЦЕ** (1925) **ПРЫВАТНАЙ ЖАНОЧАЙ ГІМНАЗІІ** П. Лявіцкага

**100** гадоў з часу адкрыцця ў **МАЁНТКУ ПЛЯНТА-ГАЦКА ПРЫВАТНАГА ЛЕСАПІЛЬНАГА ЗАВОДА** В. Пуслоўскага (Косаўскі пав.; 1925)

**100** гадоў з часу выдання дзяржаўнага (нацыянальнага) бібліяграфічнага паказальніка **«ЛЕТАПІС ПЕРЫЯДЫЧНЫХ ВЫДАННЯЎ БЕЛАРУСІ»** (г. Мінск; 1925)

**95** гадоў з пачатку выдання грамадска-палітычнага часопіса **«БЕЛАРУСЬ. BELARUS»** (г. Мінск; 1930)

**85** гадоў з часу заснавання УА «**БРЭСЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АБЛАСНЫ ЦЭНТР МАЛАДЗЁЖНАЙ ТВОРЧАСЦІ**», буйнейшай абласной установы, якая выконвае каардынацыйныя і арганізацыйныя функцыі для раённых цэнтраў пазашкольнай работы, устаноў адукацыі ў правядзенні адукацыйных, культурна-масавых мерапрыемстваў (г. Брэст; 1940)

**85** гадоў з часу заснавання ААТ **«ГІДРАСЕЛЬМАШ»**, прадпрыемства па выпуску сельскагаспадарчай тэхнікі (г. Пінск; 1940)

**85** гадоў з пачатку стварэння Столінскай сельскагаспадарчай школы паляводаў і рахункаводаў (цяпер — УА «**СТОЛІНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АГРАРНА-ЭКАНАМІЧНЫ КАЛЕДЖ**»; г. Столін; 1940)

**80** гадоў з часу адкрыцця **БРЭСЦКАГА НАСТАЎНІЦКАГА ІНСТЫТУТА** (цяпер — УА «БРЭСЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ імя А. С. ПУШКІНА»; 1945)

**80** гадоў з часу заснавання КСУП «**ПАЛЕСКАЯ ВОПЫТНАЯ СТАНЦЫЯ МЕЛІЯРАЦЫЙНАГА ЗЕМЛЯРОБСТВА і ЛУГАВОДСТВА»** (п. Палескі, Лунінецкі р-н; 1945), якое

спецыялізуецца на вытворчасці і рэалізацыі малака, мяса, кукурузы, рапсу, насення сельскагаспадарчых культур, бульбы

**80** гадоў з пачатку стварэння **БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ АКАДЭМІІ МАСТАЦТВАЎ**, вядучай вышэйшай навучальнай ўстановы па падрыхтоўцы спецыялістаў у галіне тэатральнага, выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога, кіна- і відэамастацтва і дызайну, лаўрэата спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва (2017) (г. Мінск; 1945)

**80** гадоў з пачатку выдання літаратурна-мастацкага і грамадска-палітычнага **ЧАСОПІСА «НЁМАН»** (г. Мінск; 1945)

**75** гадоў з пачатку стварэння **БРЭСЦКАГА ЗАСЛУЖАНАГА АМАТАРСКАГА АРКЕСТРА РУСКІХ НАРОДНЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ МУЗЫЧНАГА КАЛЕДЖА імя Р. ШЫРМЫ** (Брэсцкая вобл.; 1950)

**75** гадоў з часу заснавання **МЕТЭАРАЛАГІЧНАЙ СТАНЦЫІ ў г. ВЫСОКАЕ** (Камянецкі р-н; 1950)

**75** гадоў з часу заснавання **ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНАГА ЦЭНТРА пры АДМІНІСТРАЦЫІ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**, вядучай дзяржаўнай навукова-даследчай установы ў галіне інфармацыйна-аналітычнага забеспячэння дзейнасці Кіраўніка дзяржавы і Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па стратэгічных напрамках палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і духоўнага жыцця грамадства (г. Мінск; 1950)

**75** гадоў з часу стварэння **ВАДАСХОВІШЧА ПАПЕРНЯ** (Пружанскі раён; 1950)

**70** гадоў з пачатку выдання дзяржаўнага (нацыянальнага) бібліяграфічнага паказальніка **«ЛЕТАПІС ВЫЯЎЛЕНЧЫХ ВЫДАННЯЎ»** (г. Мінск; 1955)

**70** гадоў з пачатку развіцця на Беларусі **БЕЛАРУСКАГА ТЭЛЕБАЧАННЯ** (1955)

**70** гадоў з часу пабудовы **МАЛАРЫЦКАГА КАНСЕРВАВААГАРОДНІНАСУШЫЛЬНАГА КАМБІНАТА**, аднаго з буйнейшых прадпрыемстваў Беларусі ў галіне дзіцячага харчавання (г. Маларыта; 1955)

**65** гадоў з часу адкрыцця ў **КАМЯНЕЦКАЙ ВЕЖЫ АДДЗЕЛА БРЭСЦКАГА АБЛАСНОГА КРАЯЗНАЎЧАГА МУЗЕЯ**, пяціяруснай экспазіцыі, прысвечанай гісторыі г. Камянца і вежы XIII–XVI стст. (г. Камянец; 1960)

**65** гадоў з часу заснавання ДУ **«БРЭСЦКІ АБЛАСНЫ ЦЭНТР па ГІДРАМЕТЭАРАЛОГІІ і МАНІТОРЫНГУ НАВАКОЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ»**, якая ажыццяўляе на тэрыторыі Брэсцкай вобласці гідраметэаралагічную дзейнасць,

маніторынг навакольнага свету, у тым ліку радыяцыйны маніторынг, кантроль радыяактыўнага забруджвання (г. Брэст; 1960)

**60** гадоў з пачатку стварэння ААТ «**БРЭСЦКІ ПАНЧОШНЫ КАМБІНАТ»**, лаўрэата Прэміі Урада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці 2012 г. (г. Брэст; 1965)

**60** гадоў з пачатку будаўніцтва **ПРАМЫСЛОВА-ГАНДЛЁВАГА АБ’ЯДНАННЯ «ПАЛЕССЕ»**, буйнейшага вытворцы верхніх трыкатажных і паўшарсцяных вырабаў для ўсіх узроставых груп, высокааб’ёмнай пражы і трыкатажнага палатна ў Рэспубліцы Беларусь (г. Пінск; 1965)

**55** гадоў з пачатку выдання спецыялізаванага навукова-папулярнага часопіса **«АРХИТЕКТУРА и СТРОИТЕЛЬСТВО»** Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь (г. Мінск; 1970)

**55** гадоў з часу стварэння **БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА АКАДЭМІЧНАГА МУЗЫЧНАГА ТЭАТРА**, заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь, лаўрэата спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацва (2005) (г. Мінск; 1970)

**50** гадоў з пачатку будаўніцтва прадпрыемства **«ПАЛЕССЕЭЛЕКТРАМАШ»**, аднаго з вядучых вытворцаў электрарухавікоў у Беларусі (г. Лунінец; 1975)

**50** гадоў з часу заснавання ААТ **«СВІТАНАК»**, адкрытага акцыянернага таварыства па вытворчасці трыкатажу ў складзе канцэрна «Беллегпрам», лаўрэата Прэміі Урада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці (2001) (г. Жодзіна; 1975)

**40** гадоў з часу стварэння **ВАДАСХОВІШЧА СЯЛЕЦ**, створанага для водазабеспячэння сажалак рыбгаса «Сялец», увільгатнення глеб, добраўпарадкавання прылеглых населеных пунктаў (Бярозаўскі р-н; 1985)

**40** гадоў з часу стварэння **УЗОРНАГА АНСАМБЛЯ БАЛЬНАГА ТАНЦА «ФІЕСТА»**, заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь (г. Баранавічы; 1985)

**35** гадоў з часу заснавання УА «**ПІНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ КАЛЕДЖ МАСТАЦТВАЎ»** (г. Пінск; 1990), дзе рыхтуюць студэнтаў па спецыяльнасцях «Інструментальнае выкананне», «Харэаграфічнае мастацтва», «Народная творчасць», «Дызайн»

## СТУДЗЕНЬ

**90** гадоў з пачатку дзейнасці **МАГІЛЁЎСКАЙ АБЛАСНОЙ БІБЛІЯТЭКІ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА** (1935), лаўрэата спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (1998)

**85** гадоў з часу адкрыцця ў **г. БРЭСЦЕ ПЕДАГАГІЧНАГА ВУЧЫЛІШЧА** (1940–1957)

**85** гадоў з часу стварэння **БРЭСЦКАГА АБЛСПАЖЫЎСАЮЗА** (г. Брэст; 1940)

**85** гадоў з часу адкрыцця ў былым **МАЁНТКУ ПЛЯНТА СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ШКОЛЫ** (Кобрынскі р-н; 1940)

**80** гадоў з пачатку выдання **ГАЗЕТЫ «ЗОРЬКА»**, пераможцы I і IV Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая ліцера» (г. Мінск; 1945)

**60** гадоў з пачатку дзейнасці ААТ **«БАРЫСАЎСКІ ЗАВОД МЕДЫЦЫНСКІХ ПРЭПАРАТАЎ»** у складзе холдынга «Белфармпрам», лаўрэата Прэміі Урада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці (2011, 2016, 2019) (г. Барысаў; 1965)

**1 і 2** **НОВЫ ГОД**

**1** **80** гадоў з дня нараджэння **ВОЛЬГІ МІХАЙЛАЎНЫ ІПАТАВАЙ** (1945, г. п. Мір), пісьменніцы, перакладчыка, грамадскай дзеячкі, кавалера ордэна «Знак Пашаны»

**1** **70** гадоў з дня нараджэння **ПЯТРА ПЯТРОВІЧА КАЗАКЕВІЧА** (1955, Іванаўскі р-н), вучонага ў галіне механізацыі сельскай гаспадаркі, члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі

**1** **60** гадоў з часу стварэння ААТ **«БРЭСТСЕЛЬМАШ»,** створанага на базе Брэсцкага рамонтна-механічнага завода (г. Брэст; 1965)

**2** **80** гадоў з дня нараджэння **СЯРГЕЯ УЛАДЗІМІРАВІЧА КАБЯКА** (1945, Баранавіцкі р-н), вучонага-гісторыка, заслужанага работніка адукацыі Рэспублікі Беларусь, выдатніка народнай асветы

**3** **120** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА МАРЦІНАВІЧА ХАДЫКІ** (1905, Пухавіцкі р-н – 1940), паэта, перакладчыка

**3** **75** гадоў з дня нараджэння **МІКАЛАЯ** (МІКОЛЫ) **МІКАЛАЕВІЧА ТРАФІМЧУКА** (1950, Драгічынскі р-н), паэта, рэдактара

**4** **80** гадоў з дня нараджэння **ФЁДАРА ВІКТАРАВІЧА ШАСТАКА** (1945, Івацэвіцкі р-н), мастака дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (кераміка), працы якога ўпрыгожваюць інтэр’еры Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і Палаца Незалежнасці

**5** **ДЗЕНЬ ПРАЦАЎНІКОЎ САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЫ**

| | |
|---|---|
| **5** (першая нядзеля студзеня) | **ДЗЕНЬ БАНКАЎСКІХ і ФІНАНСАВЫХ РАБОТНІКАЎ** |
| **5** | **90** гадоў з дня нараджэння **РЫГОРА ІВАНАВІЧА АФАНАСІКА** (1935, Баранавіцкі р-н – 1998), вучонага ў галіне меліярацыі, доктара тэхнічных навук (1984), члена-карэспандэнта Акадэміі аграрных навук Беларусі, заслужанага меліяратара БССР (1980) |
| **5** | **80** гадоў з дня нараджэння **МІКАЛАЯ ДАНІЛАВІЧА МАЦЮХА** (1945, Столінскі р-н – 2005), фалькларыста, літаратуразнаўца |
| **7** | **РАСТВО ХРЫСТОВА** (праваслаўнае Раство) |
| **7** | **115** гадоў з дня нараджэння **КАНСТАНЦІНА СЯРГЕЕВІЧА ЗАСЛОНАВА** (1910–1942), аднаго з арганізатараў і кіраўнікоў партыйнага падполля і партызанскага руху ў Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Героя Савецкага Саюза (1943, пасмяротна) |
| **9** | **155** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСАНДРА РАМАНАВІЧА ПШЧОЛКІ** (1870, Ушацкі р-н – 1943), пісьменніка, публіцыста, этнографа, фалькларыста |
| **9** | **120** гадоў з дня нараджэння **ФЁДАРА АЛЯКСЕЕВІЧА БАРАНАВА** (1905–1982), аднаго з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на тэрыторыі Баранавіцкай вобласці, дзяржаўнага дзеяча БССР |
| **9** | **110** гадоў з дня нараджэння **ВАСІЛЯ КІРЫЛАВІЧА ШЫКІНА** (1915, Камянецкі р-н – 1999), жывапісца, творы якога захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, Брэсцкім краязнаўчым музеі, фондах Беларускага саюза мастакоў |
| **9** | **75** гадоў з дня нараджэння **РЫГОРА АЛЯКСАНДРАВІЧА ШУМАКА** (1950, Іванаўскі р-н), вучонага-юрыста, выдатніка адукацыі |
| **10** | **225** гадоў з дня нараджэння **АДАМА СУЗІНА** (1800, Кобрынскі пав. – 1879), удзельніка нацыянальна-вызваленчага руху, падарожніка, сакратара Зялёнага саюза Таварыства філаматаў |
| **11** | **225** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСАНДРА ФЕДАРАВІЧА ФОЛЬБАРТА** (1800 г. Магілёў – 1876), вучонага-прыродазнаўца, медыка-хірурга, палеантолага |
| **11** | **120** гадоў з часу атрымання гандлёвага пасведчання Р. В. Рачкоўскім на адкрыццё **КАНДЫТАРСКАЙ ФАБРЫКІ «КАМУНАРКА»,** сумеснага адкрытага акцыянернага таварыства ў складзе канцэрна «Белдзяржхарчпрам», лаўрэата Прэміі Урада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці |

(2004, 2019, 2022) (г. Мінск; 1905)

**11** **120** гадоў з пачатку дзейнасці **КАНДЫТАРСКАЙ ФАБРЫКІ «СЛОДЫЧ»,** адкрытага акцыянернага таварыства па вырабе печыва ў складзе канцэрна «Белдзяржхарчпрам», былога бісквітнага цэха кандытарскай фабрыкі «Камунарка» (г. Мінск; 1905)

**11** **95** гадоў з дня нараджэння **ІГАРА ВАСІЛЬЕВІЧА ЛАПЦІНСКАГА** (1930, г. Магілёў – 2018), акцёра, рэжысёра радыё, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры (1998), заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь (1994)

**14** **105** гадоў з дня нараджэння **МІКОЛЫ** (МІКАЛАЯ ЯКАЎЛЕВІЧА) **АЎРАМЧЫКА** (1920, Бабруйскі р-н – 2017), пісьменніка, перакладчыка, заслужанага работніка культуры БССР (1980), лаўрэата Літаратурнай прэміі БССР імя Янкі Купалы (1964)

**14** **55** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІСЛАВЫ УЛАДЗІМІРАЎНЫ СКАВАРОДК**І (1970, Украіна), мастачкі ў вобласці дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і жывапісу

**15** **125** гадоў з дня нараджэння **ПАЎЛА ВОСІПАВІЧА ГОРЫНА** (сапр. КАЛЯДА; 1900, г. Бяроза – 1938), вучонага-гісторыка, дзяржаўнага дзеяча БССР, акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук БССР

**15** **110** гадоў з дня нараджэння **ФЁДАРА ФЁДАРАВІЧА ТАРАНЕНК**І (1915–?), аднаго з кіраўнікоў партызанскага руху ў Мінскай і Брэсцкай абласцях у Вялікую Айчынную вайну

**15** **85** гадоў з часу ўтварэння Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР **РАЁНАЎ у ЗАХОДНІХ АБЛАСЦЯХ БЕЛАРУСІ** — БАРАНАВІЦКАГА, БРЭСЦКАГА, БЯРОЗАЎСКАГА, ГАНЦАВІЦКАГА, ДРАГІЧЫНСКАГА, ЖАБІНКАЎСКАГА, ІВАНАЎСКАГА, ІВАЦЭВІЦКАГА, КАМЯНЕЦКАГА, КОБРЫНСКАГА, ЛУНІНЕЦКАГА, ЛЯХАВІЦКАГА, МАЛАРЫЦКАГА, ПІНСКАГА, ПРУЖАНСКАГА, СТОЛІНСКАГА раёнаў (1940)

**15-17** **80** гадоў з часу правядзення **І АБЛАСНОГА З'ЕЗДА СЕЛЬСКІХ ЛЕКАРАЎ** (г. Брэст, 1945)

**16** **110** гадоў з часу нараджэння **ПЯТРА СЯРГЕЕВІЧА РАБЦАВА** (1915–1941), лётчыка, які адным з першых здзейсніў таран варожага самалёта ў гады Вялікай Айчыннай вайны

**16** **85** гадоў з дня нараджэння **ІВАНА ПІЛІПАВІЧА ЛАГВІНОВІЧА** (1940, Ганцавіцкі р-н – 2011), паэта

16 **65** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСАНДРА СЦЯПАНАВІЧА КУРАКА** (1960, Лунінецкі р-н), вучонага ў галіне жывёлагадоўлі

16 **65** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСАНДРА ДЗМІТРЫЕВІЧА ТРАШЧЫЛЫ** (1960, Пінскі р-н), спартсмена (лёгкая атлетыка), трэнера, заслужанага майстра спорту СССР (1988), чэмпіёна свету (1983)

17 **95** гадоў з дня нараджэння **ЛЕАНІДА КАНСТАНЦІНАВІЧА ЛУКШЫ** (1930, Пружанскі р-н – 2011), доктара тэхнічных навук, прафесара, вучонага ў галіне мостабудавання, заслужанага дзеяча навукі БССР (1990)

18 **170** гадоў з дня нараджэння **КАНСТАНЦІНА ВІКЕНЦЬЕВІЧА ХРУЦКАГА** (1855, Івацэвіцкі р-н – 1969), ваеннага дзеяча, авантурыста, які выдаваў сябе за апошняга ўдзельніка руска-турэцкай вайны 1877–1878 гг., удзельніка Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г., кавалера ордэна «Знак Пашаны» (1965)

18 **105** гадоў з дня нараджэння **ПЯТРА ПАЎЛАВІЧА ФІЛІПАВА** (1920, Клімавіцкі р-н – 2005), акцёра, заслужанага артыста БССР (1967)

19 **ДЗЕНЬ РАТАВАЛЬНІКА**

20 **65** гадоў з дня нараджэння **СЯРГЕЯ МІРОНАВІЧА ГАЙДУЧЫКА** (1915, г. Брэст – 1984), мовазнаўца-германіста, даследчыка пытанняў тэорыі нямецкай мовы, праблем яе выкладання, аўтара шэрага манаграфій

21 **ДЗЕНЬ ІНЖЫНЕРНЫХ ВОЙСКАЎ**

22 **ДЗЕНЬ ДЫПЛАМАТЫЧНАГА РАБОТНІКА**

22 **185** гадоў з часу ўтварэння **БРЭСЦКАЙ ЕПАРХІІ БЕЛАРУСКАЙ ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ** (1840), у гэты перыяд Сінод прадпісваў духавенству заходніх губерняў чытаць пропаведзі на зразумелай для прыхаджан мове, кіраўніцтву епархій больш клапаціцца аб развіцці народнай адукацыі

23 **105** гадоў з дня нараджэння **ПЯТРА АЛЯКСЕЕВІЧА ДАНЕЛІІ** (1920, г. Махачкала, Дагестан – 2012), жывапісца, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі (1995), удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, аднаго з заснавальнікаў Брэсцкай абласной арганізацыі Беларускага саюза мастакоў

23 **65** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСАНДРА КАНСТАНЦІНАВІЧА АВЕРКАВА** (1960), тэлевядучага, акцёра, рэжысёра, заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь (2010), лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры (2004), узнагароджанага медалём Францыска Скарыны (2006)

| | |
|---|---|
| **24** | **140** гадоў з дня нараджэння **ЮРЫЯ ВІКТАРАВІЧА ТАРЫЧА** (сапр. АЛЯКСЕЕЎ; 1885, г. Полацк – 1967), беларускага і расійскага кінарэжысёра, сцэнарыста, заснавальніка беларускага кіно, заслужанага дзеяча мастацтваў РСФСР (1935) і БССР, кавалера ордэна «Знак Пашаны» (1950) |
| **24** | **85** гадоў з часу адкрыцця УА «**БРЭСЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЫЧНЫ КАЛЕДЖ імя Р. ШЫРМЫ»** (г. Брэст; 1940), сярод выпускнікоў якога — заслужаныя дзеячы культуры і мастацтва |
| **26** (апошняя нядзеля студзеня) | **ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАЙ НАВУКІ** |
| **26** | **645** гадоў з часу першых звестак у гістарычных крыніцах аб **г. п. ШАРАШОВА**, у якіх змешчаны наказ вялікага князя Вітаўта аб перадачы пасёлка Мікалаю Насуце (Пружанскі р-н; 1380) |
| **27** | **85** гадоў з часу адкрыцця **БРЭСЦКАЙ АБЛАСНОЙ БІБЛІЯТЭКІ імя М. ГОРКАГА** (г. Брэст; 1940), лаўрэата спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» ў намінацыі «Бібліятэчная справа» (2002) |
| **28** | **85** гадоў з дня нараджэння **ЛЕАНІДА МАРТЫНАВІЧА ДАЙНЕКІ** (1940, Клічаўскі р-н – 2019), пісьменніка, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР у галіне літаратуры імя К. Каліноўскага (1990) і Літаратурнай прэміі імя І. Мележа (1988) |
| **30** | **90** гадоў з часу адкрыцця ў **г. БРЭСЦЕ** (1935) аддзялення **ПРАЦОЎНАГА ІНСТЫТУТА АСВЕТНІЦТВА і КУЛЬТУРЫ імя ЖЭРОМСКАГА** |
| **30** | **50** гадоў з часу дзейнасці **МАЗЫРСКАГА НАФТАПЕРАПРАЦОЎЧАГА ЗАВОДА** ў складзе канцэрна «Белнафтахім», лаўрэата Прэміі Урада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці (2002, 2010, 2015, 2018, 2021) (г. Мазыр; 1975) |

## ЛЮТЫ

**325** гадоў з пачатку **ПАЎНОЧНАЙ ВАЙНЫ 1700–1721 гг.**, вайны Швецыі і яе саюзнікаў з Рэччу Паспалітай і яе саюзнікамі

**85** гадоў з часу заснавання УА **«ПІНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МЕДЫЦЫНСКІ КАЛЕДЖ»** (г. Пінск; 1940)

1 **150** гадоў з дня нараджэння **МАРЦІНА МІХАЙЛАВІЧА КУХТЫ** (1875–1956), друкара, выдаўца кніг, заснавальніка друкарні ў Вільні

1 **85** гадоў з дня нараджэння **ВАСІЛЯ ІВАНАВІЧА БОРЫСА** (1935, Баранавіцкі р-н – 1998), педагога, партыйнага дзеяча Беларусі

2 **90** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСАНДРА ПАТАПАВІЧА ВАЛЫНЦА** (1935, Пінскі р-н), вучонага ў галіне фізіялогіі і біяхіміі раслін, лаўрэата прэміі прэзідэнтаў нацыянальных акадэмій навук Украіны, Беларусі і Малдовы (1996), прэміі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (2007)

2 **90** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА АЛЯКСАНДРАВІЧА ПРАНЬКО** (1935, Ляхавіцкі р-н), кінааператара, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР (1966)

4 **510** гадоў з дня нараджэння **МІКАЛАЯ РАДЗІВІЛА** (мян. ЧОРНЫ; 1515, г. Нясвіж – 1565), дзяржаўнага і ваеннага дзеяча Вялікага Княства Літоўскага, удзельніка вайны Маскоўскай дзяржавы з Вялікім Княствам Літоўскім 1534–1537 гг., Інфлянцкай вайны 1558–1582 гг.

5 **95** гадоў з дня нараджэння **РАСЦІСЛАВА ІВАНАВІЧА ЯНКОЎСКАГА** (1930–2016), акцёра тэатра і кіно, народнага артыста БССР (1967) і СССР (1978), лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры (1998), прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» (2003), прэміі Саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі ў галіне культуры і мастацтва (2006), кавалера ордэна Францыска Скарыны (2000), ордэна «Знак Пашаны» (1987), пераможцы конкурсу «Чалавек года» ў галіне тэатральнага мастацтва (1997), ганаровага грамадзяніна г. Мінска (2000)

5 **90** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА РЫГОРАВІЧА ЧЭРНІКА** (1935, Пружанскі р-н – 2016), паэта, педагога

6 **225** гадоў з дня нараджэння **ІГНАТА РЫГОРАВІЧА КУЛАКОЎСКАГА** (1800, Пружанскі раён – 1870), грамадскага і культурна-асветнага дзеяча, педагога

6 **75** гадоў з дня нараджэння **МІКАЛАЯ ІГНАТАВІЧА ГУРШЧАНКОВА** (1950, Гомельская вобл.), мастака ў вобласці станковай графікі і жывапісу, старшыні Брэсцкай абласной арганізацыі ГА «Беларускі саюз мастакоў» (2010–2013)

7 **75** гадоў з дня нараджэння **СЯРГЕЯ АЛЯКСАНДРАВІЧА ТРАХІМЁНКА** (1950, Расія), пісьменніка, сцэнарыста, доктара юрыдычных навук, прафесара

10 **125** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСАНДРА ХАРЫТОНАВІЧА ЮХІМЧУКА** (1900, Іванаўскі р-н – 1975),

ваеннага дзеяча, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, генерал-маёра

10 **85** гадоў з дня нараджэння **МІХАІЛА СЦЯПАНАВІЧА АМЯЛЬЯНЧЫКА** (1940, Драгічынскі р-н – 2007), вучонага ў галіне агульнай гігіены, эканомікі і спартыўнай медыцыны

11 **105** гадоў з дня нараджэння **ДЗМІТРЫЯ ВАСІЛЬЕВІЧА РУДЗЬКО** (1920, г. Петрыкаў – 1998), цымбаліста, заслужанага артыста БССР (1980), педагога

11 **90** гадоў з дня нараджэння **МІКОЛЫ** (МІКАЛАЯ СЯРГЕЕВІЧА) **КУСЯНКОВА** (1935, Добрушскі р-н – 2004), пісьменніка, лаўрэата літаратурнай прэміі імя А. Куляшова (1991), Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры (2000)

11 **85** гадоў з часу стварэння ўстановы «**ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ»** (г. Брэст; 1940)

11 **85** гадоў з часу заснавання ДУ «**НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ АРХІЎ БЕЛАРУСІ ў г. ГРОДНА»** (1940), навукова-метадычнага і навукова-даследчага цэнтра па рабоце з дакументамі Нацыянальнага архіўнага фонду Рэспублікі Беларусь у галіне архівазнаўства, крыніцазнаўства, археаграфіі і іншых дапаможных гістарычных дысцыплін

12 **130** гадоў з дня нараджэння **ПАЎЛА АЛЯКСЕЕВІЧА ТРАЙНІНА** (1895, г. Пінск – 1956), расійскага ваеннага дзеяча, контр-адмірала, удзельніка савецка-фінляндскай вайны 1939–1940 гг., Вялікай Айчыннай вайны

12 **95** гадоў з дня нараджэння **ВАЛЬМЕНА МІКАЛАЕВІЧА АЛАДАВА** (1930, г. Мінск – 2021), заслужанага архітэктара БССР (1969), прафесара, доктара архітэктуры (1999), лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры (2000), выдатніка адукацыі (2010), кавалера ордэна «Знак Пашаны» (1971), ордэна Францыска Скарыны (2021)

13 **320** гадоў з дня нараджэння **ФРАНЦІШКІ УРШУЛІ РАДЗІВІЛ** (дзяв. ВІШНЯВЕЦКАЯ; 1705–1753), пісьменніцы, паэтэсы, першай жанчыны-драматурга ў Вялікім Княстве Літоўскім, заснавальніцы Нясвіжскага тэатра Радзівілаў

13 **65** гадоў з дня нараджэння **ЮРЫЯ ІВАНАВІЧА ХІЛЬКО** (1960, г. Баранавічы), графіка, лаўрэата прэміі Міжнароднага фонду славянскага пісьменства імя св. Кірылы і Мяфодзія (1990)

14 **105** гадоў з дня нараджэння **ВАДЗІМА НІЧЫПАРАВІЧА ПАЗНЯКА** (1920, Бешанковіцкі р-н – 1997), грамадскага і дзяржаўнага дзеяча Беларусі, аднаго з арганізатараў і кіраўнікоў камсамольска-маладзёжнага падполля і

партызанскага руху ў Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, заслужанага дзеяча культуры БССР (1966)

15 **ДЗЕНЬ ПАМЯЦІ ВОІНАЎ-ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТАЎ**

15 **110** гадоў з дня нараджэння **ІВАНА КАНСТАНЦІНАВІЧА КАБУШКІНА** (1915, в. Малахоўцы, Баранавіцкі р-н – 1943), удзельніка Мінскага патрыятычнага падполля ў Вялікую Айчынную вайну, Героя Савецкага Саюза (1965)

15 **110** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСЕЯ ФЁДАРАВІЧА НАГАНАВА** (1915–1941), лэйтэнанта, удзельніка абароны Брэсцкай крэпасці 1941 г.

15 **80** гадоў з дня нараджэння **ПЯТРА ПАЎЛАВІЧА БАБЕЯ** (1945, в. Ёдчыкі, Івацэвіцкі р-н), спартсмена (барацьба вольная), трэнера, заслужанага трэнера БССР (1990), сярод выхаванцаў якога — сярэбраны прызёр чэмпіянату свету, бронзавы прызёр Сусветнай летняй універсіяды-2013, сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў — Марыя Мамашук

15 **75** гадоў з дня нараджэння **МІКАЛАЯ МІКАЛАЕВІЧА ГРЫНЧЫКА** (1950, в. Быцень, Івацэвіцкі р-н), вучонага ў галіне малекулярнай фізікі і цеплафізікі, вынаходніка, лаўрэата прэміі імя акадэміка В. А. Капцюга (2013) у складзе калектыву вучоных інстытутаў Сібірскага аддзялення Расійскій акадэміі навук і Інстытута цепла- і масаабмену імя А. В. Лыкава і Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі

16 **125** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА СЦЯПАНАВІЧА НЕСЦЯРУКА** (1900, Камянецкі р-н – 1991), ваеннага дзеяча, удзельніка Грамадзянскай, савецка-фінляндскай 1939–1940 гг. і Вялікай Айчыннай войнаў, генерал-маёра артылерыі, генерал-лейтэнанта артылерыі

16 **100** гадоў з дня нараджэння **ІВАНА ЯКАЎЛЕВІЧА НАВУМЕНКІ** (1925, Рэчыцкі р-н – 2006), народнага пісьменніка Беларусі (1995), літаратуразнаўца, грамадскага дзеяча, акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (1980), прафесара, заслужанага дзеяча навукі БССР (1978), лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1972), узнагароджанага медалём Францыска Скарыны

16 **100** гадоў з часу заснавання **ЦЭНТРАЛЬНАЙ НАВУКОВАЙ БІБЛІЯТЭКІ ІМЯ ЯКУБА КОЛАСА НАН БЕЛАРУСІ** (Мінск, 1925)

16 **85** гадоў з часу заснавання **ПІНСКАГА КАЛЕДЖА УА «БРЭСЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ імя А. С. ПУШКІНА»** (г. Пінск; 1940)

18 **130** гадоў з дня нараджэння **СЯМЁНА КАНСТАНЦІНАВІЧА ЦІМАШЭНКІ** (1895–1970), дзяржаўнага і ваеннага дзеяча, Маршала Савецкага Саюза,

двойчы Героя Савецкага Саюза (1940, 1965), камандуючага войскамі Беларускай ваеннай акругі (1945–1960)

**18** **110** гадоў з дня нараджэння **РЫГОРА САМУІЛАВІЧА ГАНЦЭВІЧА** (1915, г. Ганцавічы – 1986), мастака, які працаваў пераважна ў графіцы, карыкатуры, нагляднай агітацыі

**18** **90** гадоў з дня нараджэння **СЯРГЕЯ АЛЬБЕРТАВІЧА КАРТЭСА** (1935–2016), кампазітара, народнага артыста Беларусі, заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР (1982)

**18** **55** гадоў з часу стварэння ў **г. БРЭСЦЕ ЗАВОДА БЫТАВОЙ ХІМІІ** (цяпер — ААТ «БРЭСЦКІ ЗАВОД БЫТАВОЙ ХІМІІ»; 1970)

**19** **135** гадоў з дня нараджэння **КАЗІМІРА СВАЯКА** (сапр. КАНСТАНЦІН МАЦВЕЕВІЧ СТАПОВІЧ; 1890, Астравецкі р-н – 1926), паэта, празаіка, рэлігійнага і грамадскага дзеяча

**19** **110** гадоў з дня нараджэння **АНАТОЛЯ БЯРОЗКІ** (МАЦВЕЯ (МІТРАФАНА) ВАСІЛЬЕВІЧА СМАРШЧКА (РЭПКІ-СМАРШЧКА); 1915, Ляхавіцкі р-н – 2008), паэта, культурнага і грамадскага дзеяча беларускага замежжа (ЗША), доктара медыцыны ЗША, прафесара

**19** **90** гадоў з дня нараджэння **ГЕНАДЗЯ СЦЯПАНАВІЧА АЎСЯННІКАВА** (1935, г. Магілёў), акцёра, народнага артыста БССР (1974) і СССР (1991), лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР (1988), уладальніка прыза Беларускага саюза тэатральных дзеячаў «Крыштальная Паўлінка» (2006), спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва (2008), кавалера ордэна Францыска Скарыны (2006) і ордэна «Знак Пашаны»

**20** **80** гадоў з дня нараджэння **ТАІСЫ МІКАЛАЕЎНЫ БОНДАР** (1945, г. п. Рудзенск, Пухавіцкі р-н – 2005), пісьменніцы, перакладчыцы, грамадскай дзяячкі, лаўрэата прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» (2004)

**21** **ДЗЕНЬ РАБОТНІКАЎ ЗЕМЛЕЎПАРАДКАВАЛЬНАЙ і КАРТОГРАФА-ГЕАДЭЗІЧНАЙ СЛУЖБЫ**

**22** **125** гадоў з дня нараджэння **ФЁДАРА СЯМЁНАВІЧА КУНЬКОВА** (1900, Іванаўскі р-н – 1969), удзельніка Грамадзянскай вайны, аднаго з кіраўнікоў партызанскага руху ў Пінскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну

**22** **85** гадоў з часу стварэння УА **«ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ імя ЯНКІ КУПАЛЫ»** (г. Гродна; 1940), у якім рыхтавалі настаўнікаў 5–7-х класаў няпоўнай сярэдняй школы

23 **ДЗЕНЬ АБАРОНЦАЎ АЙЧЫНЫ і УЗБРОЕНЫХ СІЛ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

23 **80** гадоў з часу адкрыцця ў **г. БРЭСЦЕ ДЗІЦЯЧАГА КІНАТЭАТРА** (1945)

23 **65** гадоў з часу стварэння Брэсцкага трэста **«БРЭСТГАЗ»** (цяпер — УП «БРЭСТАБЛГАЗ»; г. Брэст; 1960)

24 **105** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСЕЯ ЛЕАНІДАВІЧА АНДРЭЕВА** (1920–1999), расійскага і беларускага артыста балета, балетмайстра, заслужанага артыста РСФСР (1957), заслужанага дзеяча мастацтваў БССР (1963)

24 **90** гадоў з дня нараджэння **РЫГОРА ІВАНАВІЧА БАРАДУЛІНА** (1935, Ушацкі р-н – 2014), народнага паэта Беларусі (1992), перакладчыка, рэдактара, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы (1976), ганаровага доктара Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдата на Нобелеўскую прэмію (2006), кавалера ордэна «Знак Пашаны», узнагароджанага медалём Францыска Скарыны

25 **120** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСЕЯ ЯЎХІМАВІЧА КЛЯШЧОВА** (1905 ці 1902, Калінкавіцкі р-н – 1968), партыйнага і дзяржаўнага дзеяча БССР, аднаго з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху ў Пінскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, генерал-маёра, Героя Савецкага Саюза (1944)

25 **105** гадоў з дня нараджэння **ПЯТРА** (ПЯТРА ФЁДАРАВІЧА) **ПРЫХОДЗЬКІ** (1920, Хоцімскі р-н – 2006), паэта, перакладчыка, лаўрэата літаратурнай прэміі імя А. Куляшова (1985)

25 **80** гадоў з дня нараджэння **ВОЛЬГІ МІХАЙЛАЎНЫ КЛЕБАНОВІЧ** (па мужу ДЗЯНІСАВА; 1945), актрысы, народнай артысткі Беларусі (1995), лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР (1986), уладальніцы прыза Беларускага саюза тэатральных дзеячаў «Крыштальная Паўлінка» (2003)

27 **90** гадоў з дня нараджэння **ФЁДАРА ДАНІЛАВІЧА КЛІМЧУКА** (1935, Драгічынскі р-н – 2018), мовазнаўца, аўтара прац па беларускай дыялекталогіі, лінгвагеаграфіі, сацыялінгвістыцы, анамастыцы, фальклоры, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне гуманітарных і сацыяльных навук (2000)

28 **115** гадоў з дня нараджэння **АЛЕСЯ ДУБРОВІЧА** (сапр. АЛЯКСЕЙ РЫГОРАВІЧ РЭДЗЬКА; 1910, Глыбоцкі р-н – 1942), паэта, удзельніка вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, аднаго з ініцыятараў стварэння Літаратурнага фронту сялянска-рабочых пісьменнікаў

**28** **85** гадоў з дня нараджэння **МАРАТА РЫГОРАВІЧА КЛІМАВА** (1940, в. Выганашчы, Івацэвіцкі р-н – 2019), мастака ў вобласці манументальна-дэкаратыўнага і станковага жывапісу, кавалера ордэна «Знак Пашаны» (1986)

## САКАВІК

**60** гадоў назад у **г. БРЭСЦЕ** заснавана **ЭКСКУРСІЙНАЕ БЮРО** (1965)

1 **75** гадоў з дня нараджэння **МІКАЛАЯ АЛЯКСЕЕВІЧА МАЕЎСКАГА** (1950, в. Дварцы, Камянецкі р-н), мастака дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, жывапісца

2 **80** гадоў з дня нараджэння **ВАСІЛЯ ВАСІЛЬЕВІЧА ШАПЯЛЕВІЧА** (1945, Пінскі р-н – 2024), вучонага-фізіка, доктара фізіка-матэматычных навук, аўтара навуковых даследаванняў па галаграфіі ў фотарэфрактыўных крышталях, лаўрэата прэміі імя акадэміка Ф. І. Фёдарава Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (2011)

3 **100** гадоў з дня нараджэння **ЗІНАІДЫ МІКАЛАЕЎНЫ ЛЕЎЧАНКА** (1925, Расія – 1980), архітэктара, аўтара шэрага праектаў у Брэсце, заслужанага архітэктара БССР (1971)

3 **80** гадоў з дня нараджэння **МІКАЛАЯ ЦІМАФЕЕВІЧА ЯРЧАКА** (1945, Івацэвіцкі р-н), вучонага-псіхолага, аўтара прац па праблемах агульнай псіхалогіі, псіхалогіі мовы і мыслення, развіцця маўлення на роднай і замежнай мовах

4 **ДЗЕНЬ МІЛІЦЫІ**

4 **135** гадоў з дня нараджэння **ВІНЦУКА АДВАЖНАГА** (сапр. ЯЗЭП СТАНІСЛАВАВІЧ ГЕРМАНОВІЧ; 1890, Ашмянскі р-н – 1978), пісьменніка, рэлігійнага дзеяча

5 **120** гадоў з дня нараджэння **ІВАНА ІВАНАВІЧА БАБРОВА** (1905, Цвярская губ., Расія – 1943), дзяржаўнага дзеяча БССР і аднаго з кіраўнікоў партызанскага руху на тэрыторыі Брэсцкай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны

5 **95** гадоў з дня нараджэння **МІХАІЛА АНДРЭЕВІЧА КАРПУКА** (1930, Камянецкі р-н – 2018), мастака кіно і тэлебачання, графіка, жывапісца

6 **60** гадоў з дня нараджэння **ЛЮДМІЛЫ ВІКТАРАЎНЫ ХАРЫЧКАВАЙ** (1965, г. Брэст), вучонага-гісторыка, даследчыка рэлігійнай палітыкі імператарскай улады Рымскай Імперыі, аўтара прац па гісторыі антычнага хрысціянства

7 **75** гадоў з дня нараджэння **ВАСІЛЯ ПЯТРОВІЧА РАІНЧЫКА** (1950, Шклоўскі р-н), кампазітара, піяніста, музычнага і грамадскага дзеяча, народнага артыста Беларусі (1995), мастацкага кіраўніка вакальна-інструментальнага

ансамбля «Верасы» (з 1974 г.), кавалера ордэна «Знак Пашаны» (2006)

**8** **ДЗЕНЬ ЖАНЧЫН**

**8** **115** гадоў з дня нараджэння **ПЁТРЫ** (ПЯТРА ВАСІЛЬЕВІЧА) **КОНЮХА** (1910, Карэліцкі р-н – 1994), сусветна вядомага опернага спевака, педагога

**8** **95** гадоў з дня нараджэння **ЯРАСЛАВА СІЛЬВЕСТРАВІЧА ПАРХУТЫ** (1930, Івацэвіцкі р-н – 1996), пісьменніка, краязнаўца, журналіста, падарожніка

**9** **100** гадоў з дня нараджэння **ТАМАРЫ МІКАЛАЕЎНЫ НІЖНІКАВАЙ** (1925–2018), артысткі оперы (каларатурнае сапрана), педагога, народнай артысткі Беларусі і СССР, кавалера ордэнаў Айчыны III ступені, Дружбы народаў, Францыска Скарыны, уладальніцы знака Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За ўклад у развіццё культуры Беларусі» (2005)

**10** **105** гадоў з дня нараджэння **АРКАДЗЯ НІЧЫПАРАВІЧА МАРЦІНОВІЧА** (1920, Глускі р-н – 2009), празаіка, паэта, заслужанага дзеяча культуры БССР (1980), удзельніка Вялікай Айчыннай вайны

**10** **95** гадоў з дня нараджэння **МІКАЛАЯ СЦЯПАНАВІЧА КІРЫЛАВА** (1930–2007), мастака, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР (1991)

**13** **100** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСАНДРА ПЯТРОВІЧА ХАПАЛЮКА** (1925, Маларыцкі р-н – 2010), вучонага-фізіка, аўтара прац па фізічнай оптыцы і лазернай фізіцы

**13** **25** гадоў з часу заснавання **МАСТАЦКАГА МУЗЕЯ г. БРЭСТА**, філіяла Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея (2000; адкрыты для наведвальнікаў 17 мая 2002 г.)

